ЗВЯЗДА

# Стартуе новы конкурс для маладых літаратараў з Беларусі і Расіі «Мост Дружбы»

**Пастаянны Камітэт Саюзнай дзяржавы і Нацыянальны прэс-цэнтр Рэспублікі Беларусь аб’яўляюць пра старт конкурсу маладых літаратараў «Мост Дружбы-2020».**

Юбілейны (пяты па ліку) конкурс па традыцыі аб’яднае таленавітых аўтараў з Беларусі і Расіі ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў.

Па выніках папярэдніх конкурсаў больш за 30 маладых пісьменнікаў сталі лаўрэатамі гэтага спаборніцтва. Новы конкурс — новы шанц заявіць пра сябе, атрымаць неацэнныя парады прафесіяналаў з ліку Экспертнага савета конкурсу, а таксама магчымасць апублікаваць свой твор у спецыяльным альманаху.

Конкурс арыентаваны на адкрыццё новых імёнаў у літаратуры, прыцягненне увагі маладых і таленавітых аўтараў да гісторыі, культуры і літаратурных традыцый Расіі і Беларусі, будаўніцтву Саюзнай дзяржавы.

На конкурс «Мост Дружбы» прымаюцца творы малой літаратурнай формы (апавяданне, нарыс, эсэ), не апублікаваныя раней, якія не ўдзельнічалі ў іншых конкурсах. Кожны ўдзельнік мае права накіраваць толькі адзін празаічны твор, напісаны ім на рускай або беларускай мове.

Галоўныя мэты конкурсу — **прадастаўленне маладым аўтарам з Беларусі і Расіі магчымасці першай публікацыі і прасоўванне іх твораў да чытача.**

Работы і заяўкі (прозвішча, імя, узрост, месца жыхарства, месца вучобы / працы, тэлефон, электронны адрас, кароткая біяграфічная даведка, фатаграфія) будуць прымацца да 30 верасня 2020 года ўключна толькі па электронным адрасе **info@bpc.by** з пазнакай **«Мост дружбы».**

Удзел у конкурсе «Мост Дружбы» з’яўляецца бясплатным. Пераможцам уручаюцца дыпломы, а іх творы публікуюцца ў літаратурным альманаху, які будзе распаўсюджвацца ў Беларусі і Расіі.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

[Крыніца]